# СУЧАСНЫЯ МЕТАДЫ ПРАЦЫ З МУЗЕЙНАЙ АЎДЫТОРЫЯЙ (на прыкладзе Літаратурнага музея Максіма Багдановіча)

**І. У. Шорац,** *вядучы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Максіма Багдановіча*

Складанасць сучаснага перыяду развіцця нашага грамадства, маштабнасць яго сацыяльных, культурных і эканамічных праблем абумоўліваюць актуальнасць пошуку аптымальных шляхоў павышэння эфектыўнасці сацыяльнага выхавання. У гэтай плыні культура можа быць актыўным фактарам сацыяльнай адаптацыі асобы, які дапаможа захаваць і перадаць духоўныя, культурныя каштоўнасці наступным пакаленням, і разам з тым фактарам развіцця творчага пачатку чалавека, сродкам выхавання сацыяльнай актыўнасці і пераадолення негатыўных жыццёвых выпрабаванняў. Сёння ўзрастае значэнне ўстаноў культуры, у тым ліку музеяў, якія з'яўляюцца неад'емнай часткай сістэмы сацыяльнага выхавання. Музеі валодаюць шырокімі магчымасцямі для фарміравання эстэтычнага густу грамадства, сацыяльнай адаптацыі асобы, развіцця інтэлектуальных і творчых здольнасцей, набыцця новых ведаў, дзякуючы гэтаму яны ствараюць і гарманізуюць інфармацыйную прастору.

Музей у сучасным грамадстве – не толькі навукова-асветная ўстанова, але і цэнтр культуры, які вырашае задачы развіцця і выхавання асобы. Музей і музейныя экспанаты маюць унікальную магчымасць адначасова ўздзейнічаць на інтэлектуальныя, валявыя і эмацыйныя рэакцыі наведвальніка, а кожная экспазіцыя ўяўляе сабой праграму па перадачы праз экспанаты ведаў, навыкаў, думак, ацэнак і пачуццяў.

Менавіта музей дапамагае вынаходзіць шматлікія спосабы асваення культуры, фарміраваць устойлівую неабходнасць азнаямлення з яе каштоўнасцямі.

Музей мае свой шлях, свае магчымасці ўздзеяння на чалавека, сваю адукацыйную задачу – фарміраванне каштоўнасных, асобасных, эмацыйных адносін да культурнай спадчыны і светапогляду ў цэлым.

Разгледзім сучасныя метады працы з наведвальнікамі ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пастанова аб стварэнні Літаратурнага музея Максіма Багдановіча прынята 19 верасня 1980 г. З 1 красавіка 1981 г. музей пачаў дзейнічаць як установа культуры. Група мастакоў і музейных супрацоўнікаў працавала над стварэннем экспазіцыі музея, якая была адкрыта для наведвальнікаў 8 снежня 1991 г. У доме, пазбаўленым мемарыяльнасці, з дапамогай экспанатаў і мастацкіх прыёмаў быў адлюстраваны непаўторны Максімаў паэтычны свет і яго кароткі, яркі жыццёвы шлях.

Музей аформлены ў стылі «мадэрн», менавіта такі напрамак мастацтва панаваў у канцы XIX – пачатку XX ст. Элементы мадэрна былі выкарыстаны пры афармленні столі, рамак у экспазіцыйных нішах, стылёвыя элементы прысутнічаюць у складаным пластычным малюнку вырабаў з саломкі, рытмічным чаргаванні модуляў мэблевай канструкцыі, у вітражах.

Аўтар мастацкай канцэпцыі – Эдуард Канстанцінавіч Агуновіч, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь. За афармленне экспазіцыі Літаратурнага музея М. Багдановіча Э. К. Агуновічу прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь (1993 г.).

Сярод самых каштоўных экспанатаў музея – зборнік «Вянок», арыгінальныя фотаздымкі, рукапісны зборнік вершаў «Зеленя», некалькі аўтографаў.

Кожная з пяці залаў экспазіцыі адлюстроўвае пэўны перыяд жыцця паэта, цесна звязана з асобнай тэмай яго творчасці і перагукаецца з цыкламі вершаў зборніка «Вянок». Уся экспазіцыя пабудавана на глыбокім сімвалізме. Кожная зала мае свой экспанат-сімвал: ручнік, які вышывала маці паэта, слуцкі пояс, арыгінальны зборнік вершаў «Вянок», геліягравюра «Сікстінская Мадонна» (фрагмент знакамітай карціны Рафаэля). Значнае месца ў экспазіцыі музея займаюць мемарыяльныя прадметы, фотаздымкі, кнігі сям'і Багдановічаў. Экспазіцыя аднаўляецца цыкламі вершаў, апавяданнямі, літаратурна-крытычнымі і публіцыстычнымі творамі.

Літаратурны музей Максіма Багдановіча ажыццяўляе актыўную дзейнасць у разнастайных кірунках з наведвальнікамі музея. Большую частку наведвальнікаў складаюць школьнікі, таму музейнымі супрацоўнікамі распрацаваны аглядная экскурсія – «Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць» і тэматычныя – «Любоўная лірыка Максіма Багдановіча», «Фальклорныя матывы ў творчасці Максіма Багдановіча», «Пейзажная лірыка Максіма

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Багдановіча». Навуковыя супрацоўнікі чытаюць тэматычныя лекцыі: «Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць», «Зачараванае царства», «Пейзажная лірыка Максіма Багдановіча», «Любоўная лірыка Максіма Багдановіча».

Сучасны наведвальнік патрабуе новага і забаўляльнага, таму былі створаны новыя інтэрактыўныя формы работы з музейнай аўдыторыяй. Пошук зносін з наведвальнікамі музея абумоўлены складанасцю задачы: перадаваць і захоўваць у памяці беларусаў і наогул усіх наведвальнікаў музея таленавітае паэтычнае слова аб любві і адданасці, самых, пэўна, моцных чалавечых пачуццях. Супрацоўнікі экскурсійна-масавага аддзела музея распрацоўваюць інтэрактыўныя музейныя заняткі, якія разлічаны на наведвальнікаў рознага ўзросту. Галоўнай мэтай музейна-педагагічных праграм з'яўляецца вырашэнне праблем развіцця асобы, таму сёння музей ставіць перад сабой наступныя задачы. На прыкладзе прыгожага пісьменства:

– далучаць наведвальнікаў да беларускай літаратуры, а менавіта творчасці яе класіка Максіма Багдановіча;

– уздзейнічаць на духоўна-пазнавальныя патрэбнасці;

– уплываць на эмацыянальную сферу і эстэтычнае ўспрыняцце;

– развіваць матывацыю (эстэтычную, этычную, пазнавальную);

– фарміраваць камунікатыўныя навыкі;

– на прыкладзе экспазіцыі музея павышаць музейную культуру і візуальную адукаванасць.

Праект літаратурных музеяў, які распачаўся ў верасні 2011 г. − «Сямейнае падарожжа “Музейныя хованкі”», ажыццяўляецца на Беларусі ўпершыню і разлічаны на сямейных наведвальнікаў, бацькоў з дзецьмі, якія прыйшлі ў музей не ў складзе экскурсійнай групы, а самастойна. Рэкамендаваны ўзрост дзяцей – ад 6 да 13 гадоў. Форма правядзення – самастойнае падарожжа па экспазіцыі з інтэрактыўным пуцяводнікам, распрацаваным асобна кожным музеем. Музеі – удзельнікі праекта: Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Літаратурны музей Петруся Броўкі і Літаратурны музей Максіма Багдановіча.

У першым музеі наведвальнік атрымлівае пашпарт удзельніка, з якім наведвае ўсе астатнія музеі. Пасля праходжання маршруту ў апошнім музеі наведвальніку ўручаецца дыплом нястомнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падарожніка. Завершыцца праект абраннем з ліку ўдзельнікаў пераможцаў, якія і атрымаюць галоўны прыз.

Мэта праекта:

− праз выкарыстанне гульнёвага пуцяводніка пазнаёміць юных наведвальнікаў з экспазіцыяй музея, зацікавіць экспанатамі;

− увесці ў практыку музея новыя інтэрактыўныя формы дзейнасці, якія ўплываюць на фарміраванне станоўчага іміджу музея;

− на прыкладзе асобы Максіма Багдановіча будзіць сама-свядомасць, вернасць сваім караням, матчынаму слову;

– ладзіць творчае супрацоўніцтва з музеямі – удзельнікамі праекта.

Актыўны ўдзел у гэтым праекце (140 удзельнікаў) сведчыць, што такія формы працы з наведвальнікамі запатрабаваны.

З усім тым музей не скарачае так званыя традыцыйныя формы дзейнасці: літаратурна-музычныя вечарыны, прэзентацыі, сустрэчы з творчымі асобамі, арганізоўвае перасоўныя і часовыя выставы, праводзіць музейныя святы. Як правіла, свята аб’ядноўвае некалькі форм музейнай дзейнасці. Так, напрыклад, падчас музейнага свята «Ноч музеяў», якое адбываецца ў межах святкавання Міжнароднага дня музеяў, у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча абавязкова задзейнічана экспазіцыя, на якой адбываюцца тэатралізаваныя прад-стаўленні з элементамі ролевых гульняў, конкурсаў, майстар-класаў («Вяселле − NON STOP» – музейнае свята 2010 г.).

Уся дзейнасць музея, само яго існаванне служаць таму, каб не згасла ў беларускім небе і ў сэрцах беларусаў зорка Максіма, якая нездарма ўзышла на небасхіле. Аналіз дзейнасці Літаратурнага музея Максіма Багдановіча паказвае, што музей запатрабаваны, і ў прыватнасці школьнай аўдыторыяй, а зваротная сувязь наведвальнік – музей падказвае, якія формы дзейнасці музея знойдуць водгук у яго аўдыторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ